Актуальность этой проблемы состоит в том, что влияние гаджетов на сон может проявляться различными способами, которые зависят от состояния психического и психологического здоровья человека. Также не стоит забывать о положительном и отрицательном влиянии гаджетов на психологическое состояние людей.

Световое загрязнение прежде всего влияет на циркадные ритмы организма человека. Это реализуется через нарушение выработки мелатонина. Синий свет (с длиной волны около 450-480 нм) вызывает чувство настороженности и нарушения суточного биоритма. Отметим, что все электронные устройства являются источниками данного света.

Влияние шума на сон проявляется через нарушение нормального течения сна. Оно реализуется через повышенные телодвижения во время сна, возможность пробуждения, увеличение раздражительности. Все это сугубо индивидуально проявляется во время сна. Замечено, что наибольшее влияние оказывают эмоционально окрашенные звуки.

Но помимо отрицательно влияния гаджеты могут положительно воздействовать на сон. Это проявляется через получение положительных эмоций от чтения книг и прослушивания успокаивающей музыки. Положительное влияние также помогает улучшить погружение в сон и противостоять стрессу.

## ПЕРСПЕКТЫВЫ І ПАДЫХОДЫ ДА ТУРЫСТЫЧНАГА ВЫКАРЫСТАННЯ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ПОМНІКАЎ МЯДЗЕЛЬСКАГА РАЁНА

## PROSPECTS AND APPROACHES TO THE TOURIST USE OF ARCHAEOLOGICAL MONUMENTS OF MYADZEL DISTRICT

***Э. А. Астаповіч, М. А. Плавінскі***

***E. Astapovich, M. Plavinski***

*УП «Белдзіпралес», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*kolencur@mail.ru*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*plavinsky_arc@mail.ru*
*UE «Beldziprales», Minsk, Republic of Belarus*
*Belarusian State University, ISEI BSU, Minsk, Republic of Belarus*

У артыкуле разглядаюцца асноўныя падыходы да турыстычнага выкарыстання археалагічных помнікаў Мядзельскага раёна.

The article considers the main approaches to the tourist use of the archaeological monuments of Myadzel district

*Ключавыя словы:* археалагічныя помнікі, турызм, Мядзельскі раён Рэспублікі Беларусь.

*Keywords*: archaeological monuments, tourism, Myadzel district of the Republic of Belarus.

Мядзельскі раён – адзін з найбагацейшых на гістарычную спадчыну раёнаў Беларусі. Спалучэнне ўнікальных прыродных і культурных ландшафтаў Мядзельшчны ствараюць шырокія магчымасці для рэкрэацыі і развіцця турызму ў рэгіёне. Але калі помнікі прыроды і архітэктуры ўжо выкарыстоўваюцца ў мэтах турыстычнага паказу даволі шырока, то гэтага нельга сказаць пра помнікі археалогіі. Сярод іх ёсць стаянкі каменнага і бронзавага вякоў, гарадзішчы і селішчы жалезнага веку і ранняга Сярэднявечча, славянскія гарадзішчы, селішчы і курганныя могільнікі канца I – пачатку II тыс. н. э., замчышчы і рэшткі колішніх сядзібных комплексаў. Шмат якія з іх ўжо назаўсёды згублены ў выніку гаспадарчай дзейнасці, многія знаходзяцца пад пагрозай знікнення ці пашкоджаны ў выніку розначасавай дзейнасці скарбашукальнікаў, значная частка помнікаў альбо не вывучана, альбо вывучана вельмі слаба. Бракуе нават канцэпцый іх выкарыстання ў культурным жыцці нашай краіны.

Для пераўтварэння помніка археалогіі ў аб’ект турыстычнага паказу неабходна правядзенне мерапрыемстваў па яго добраўпарадкаванні і музеефікацыі. У якасці прыкладу можна разгледзець адзін з найбольш значных і яскравых помнікаў археалогіі раёна – Мядзельскі замак. Пытанне добраўпарадкавання Мядзельскага замка можа разглядацца як у кантэксце музеефікацыі гарадской прасторы горада Мядзеля, так і індывідуальна. Найбольш актуальнай праблемай для паказу Мядзельскага замка на цяперашні час з’яўляецца адсутнасць уладкаванага падыходу да яго. Замак размяшчаецца на паўвостраве, што злучаны з горадам моцна забалочаным перашыйкам, праз які пракладзена трухлявая драўляная кладка. З мэтай павышэння турыстычнай прывабнасці замчышча неабходна правесці ў парадак прылеглую тэрыторыю.

У далейшым, абапіраючыся на выніке археалагічных даследаванняў, можа быць распрацаваная архітэктурная канцэпцыя музеефікацыі Мядзельскага замка. Найменш затратнай ў фінансавым плане формай музеефікацыі з’яўляецца выяўленне і ўкладанне сродкаў для добраўладкавання планіровачнай структуры замка (перыметра

яго абарончых збудаванняў), уладкаванне інфармацыйных стэндаў і шыльдаў. У якасці яшчэ аднаго сродку можа быць выкарыстана раскрыццё, кансервацыя і экспанаванне падмуркаў замкавай вежы ў культурным пласце, што вядома як «метад натуральнай кансервацыі». Такая практыка даўно ўжо трывала заняла сваё месца ў працэсе музеефікацыі і рэгенерацыі гістарычных тэрыторый па ўсёй Еўропе. Ёсць падобныя прыклады ў Беларусі.

Калі разглядаць іншыя помнікі археалогіі Мядзельшыны, варта адзначыць, што далёка не ўсе яны прыдатныя для турыстычнага паказу. Так, напрыклад, помнікі эпохі каменнага і бронзавага вякоў вызначаюцца толькі наяўнасцю культурнага пласта. Візуальна ў сістэме культурнага ландшафт гэтыя аб'екты не вызначаюцца, што ўскладняе іх турыстычны паказ. Такія археалагічныя помнікі могуць быць толькі пазначаны ў прасторы інфармацыйнымі шыльдамі ці стэндамі, сродкамі ландшафтнага дызайну ці добраўпарадкавання.

Найбольш прыдатнымі для турыстычнага выкарыстання з'яўляюцца помнікі, якія вылучаюцца сваімі памерамі і формай ў ландшафце і з'яўляюцца дамінантнымі візуальнымі пунктамі. Да іх можна аднесці гарадзішчы і курганныя могільнікі. Гарадзішчы жалезнага веку і эпохі ранняга Сярэднявечча пасля правядзення прац па добраўпарадкаванні, стварэнні сістэмы ланlшафтнага дызайну і ўключэнні ў экскурсійныя маршруты павінны стаць аб'ектамі турыстычнага паказу, якія адлюстроўваюць дапісьмовы перыяд гісторыі рэгіёна. Курганныя могільнікі таксама могуць стаць адметнымі кропкамі для наведвання турыстамі ў рамках экскурсійных маршрутаў.

Варта адзначыць і турыстычную значнасць Мядзельскага раённага музея народнай славы. Выяўленыя ў выніку археалагічных даследаванняў артэфакты з'яўляюцца музейнымі прадметамі ці прадметамі, якія маюць музейнае значэнне. Таму вельмі важнай задачай з'яўляецца музеефікацыя археалагічных знаходак і іх уключэнне ў склад экспазіцыі Мядзелькага музея. Актуальным з'яўляецца і пытанне аб стварэнні археалагічнага музея Мядзельшчыны, які можа функцыянаваць як філіял Мядзельскага раённага музея народнай славы, так і на базе Нацыянальнага парка «Нарачанскі».

Акрамя таго, турыстычнае выкарыстанне археалагічных помнікаў Мядзельскага раёна патрабуе дэталёвай распрацоўкі розных відаў турыстычных маршрутаў. З мэтай усебаковага ахопу археалагічнай спадчыны рэгіёна, не выкрэсліваючы пры гэтым помнікі прыроды і архітэктуры, патэнцыяльным спажыўцам паслугі неабходна прапанаваць шырокі спектр розных маршрутаў: аўтобусных, веласіпедных, пешаходных, водных. Нягледзячы на значную плошчу прыродаахоўных зон, тэрыторыя раёна пакрытая густой сеткай аўтамабільных дарог і злучана з буйнымі транспартнымі артэрыямі краіны (аўтадарогі Р28, Р45, Р58). Гэта дае значную лагістычную перавагу аўтобуснаму транспарту, бо турыстычныя паездкі могуць збіраць людзей у любым горадзе Беларусі.

## ПОТЕНЦИАЛ ГИЛОЗОИЗМА В ПЕРСПЕКТИВЕ ЭКОФИЛОСОФСКОГО РАЗВИТИЯ МОДЕЛИ СОВРЕМЕННОГО МИРА

## POTENTIAL OF HYLOZOISM IN THE PERSPECTIVE OF ECO-PHILOSOPHICAL DEVELOPMENT MODEL OF THE MODERN WORLD

***Э. В. Баркова***

***E. Barkova***

*Российский экономический университет имени Г. В. Плеханова,*
*г. Москва, Российская Федерация*
*barkova3000@yandex.ru*
*Plekhanov Russian University of Economics, Moscow, Russia*

Гилозоизм исследуется как условие структурирования целостности экофилософской модели современного мира, принцип экорациональности и парадигмальная основа, открывающая смысл одухотворенности как тип связи современного человека с миром.

Hylozoism is investigated as a condition for structuring the integrity of the ecophilosophical model of the modern world, the principle of ecological rationality and the paradigmatic foundation that reveals the meaning of spirituality as a type of connection between modern man and the world.

*Ключевые слова:* человек, современный мир, культура, экорациональность, гилозоизм, диалог, человека с Землей, экофилософия, одухотворенность, мироотношение.

*Keywords:* human, the modern world, culture, eco-rationality, hylozoism, human-Earth dialogue, eco-philosophy, spirituality, attitute to the world.

Востребованность смены доминирующей парадигмы в освоении современного мира и обновления типа научной рациональности – свидетельство как изменения статуса субъекта в познании, так и недостаточности формализованного анализа, с которым, как правило, связывается стиль научного мышления. Эта недостаточность выражается в том, что в поле зрения не попадает живой контекст реальности, включая общество, поскольку они